# «ЗЯМЛЯ МАЯ, ТЫ — КНІГА НЕ





***Гэтыя паэтычныя радкі беларускай пісьменніцы Ларысы Геніюш не страцілі сваёй актуальнасці і сёння. Беларусь – гэта вядомыя ў свеце старажытныя славутасці, прыгожыя і незабыўныя краявіды, мілагучная мова, шмат нязведаных сцяжынак і дарог, якія павінен ведаць кожны з нас.***

***21 лютага ва ўсім свеце адзначаецца Дзень роднай мовы. Гэта яна вядзе нас па жыцці, дапамагае думаць, марыць і быць людзьмі. Дзякуючы мове, мы знаёмімся з гісторыяй, культурай і звычаямі народа.***

***Напярэдадні свята мы спыталі ў супрацоўнікаў і выкладчыкаў нашага ўніверсітэта:***

***1. Якое месца ў Беларусі вы б параілі наведаць?***

***2. Якую кнігу вы б параілі прачытаць?***

***3. Якія беларускія народныя звычаі неабходна захаваць?***

**Анатоль Мікалаевіч ДУЛАЎ, дацэнт, кандыдат гістарычных навук, загадчык кафедры гісторыі Беларусі:**

**1.** У Беларусі безліч месцаў, якія варта наведаць. Думаю, сярод іх, безумоўна, старадаўні Полацк – калыска нашай дзяржаўнасці, цэнтр духоўнасці і культуры; Навагрудак, з якім звязаны пачаткі Вялікага Княства Літоўскага; «каралеўскі» горад Гродна, у архітэктуры якога адлюстраваліся розныя гістарычныя эпохі; вёска Мосар на Глыбоччыне – «беларускі Версаль», вельмі маляўнічае і ўтульнае месца.

**2.** Маладым людзям я б параіў найперш прачытаць класічныя творы нашага земляка Уладзіміра Караткевіча, яго аповесць «Дзікае паляванне караля Стаха», раманы «Чорны замак Альшанскі» і «Каласы пад сярпом тваім». Мой улюбёны твор Караткевіча – філасофска-алегарычная аповесць «Ладдзя роспачы». Не менш цікавая гістарычная проза Уладзіміра Арлова і Кастуся Тарасава. З твораў апошніх гадоў хачу звярнуць увагу на антыўтопію Віктара Марціновіча «Мова» – твор, які падштурхоўвае да роздуму пра будучыню і сучаснасць.

**3.** Усе народныя звычаі і абрады, вусная народная творчасць, сама беларуская мова – наша багацце, якое вымагае захавання. Таксама вялікую каштоўнасць уяўляюць традыцыйныя рамёствы беларусаў – ручное ткацтва, ганчарства, лозапляценне, саломапляценне і іншыя. Вельмі важна, каб традыцыі працягвалі жыццё.



**Юрый Міхайлавіч БАБІЧ, дацэнт, кандыдат філалагічных навук, дацэнт кафедры беларускага мовазнаўства:**

**1.** Я думаю, што ў Беларусі шмат месцаў, якія варта было б абавязкова наведаць і нават не адзін раз. Але, па-першае, як мне падаецца, трэба паехаць у Навагрудак – знакавы горад для кожнага беларуса. Гэта месца, дзе ўсё дыхае нашай гісторыяй. Навагрудак асацыіруецца са станаўленнем Беларусі.

**2.** Я не магу параіць толькі адну кнігу, бо беларуская літаратура – гэта вялікая літаратура. Але, перш за ўсё, трэба прачытаць «Новую зямлю» Якуба Коласа. У паэме не проста сканцэнтраваны погляд аўтара на жыццё беларусаў, а ўвогуле паказаны беларускія звычаі і традыцыі, якія былі раней і ёсць сёння.

**3.** У беларусаў вельмі шмат звычаяў, якія адлюстроўваюць іх эмацыянальна-этнічную адметнасць. На мой погляд, трэба захаваць калядаванне, у якое закладзены вельмі глыбокі сэнс. На жаль, адыходзіць у нябыт вельмі папулярны звычай, калі падчас Вялікадня хадзілі валачобнікі, спявалі песні, ігралі на музычных інструментах. У мяне гэта заўсёды выклікала вялікае захапленне.

**Вольга Іванаўна КАНОПЛІЧ, начальнік вучэбна-метадычнага аддзела Інстытута павышэння кваліфікацыі і падрыхтоўкі кадраў:**

**1.** Я раю часцей бываць на сваёй малой радзіме. Для мяне гэта Аршаншчына. Тут самыя прыгожыя, знаёмыя з маленства краявіды. Таксама кожнаму беларусу трэба наведаць возера Нарач і Бярэзінскі біясферны запаведнік, каб убачыць усё самае лепшае, што ёсць у нашай краіне.

**2.** Я лічу, што трэба чытаць і перачытваць класікаў: Уладзіміра Караткевіча і Васіля Быкава. У іх творах адлюстраваны наша культура і беларускія традыцыі.

**3.** Больш за ўсё мне падабаецца свята Купалле, якое мы заўсёды святкуем у вёсцы. Цудоўна, што ў гэтыя дні збіраецца разам уся сям'я. У мяне нават вяселле было 6 і 7 ліпеня.



**Вольга Іванаўна РУСІЛКА, дацэнт, кандыдат філалагічных навук, дацэнт кафедры літаратуры, член Саюза пісьменнікаў Беларусі:**

**1.** Усім раю наведаць маю родную вёску Берšты ў Шчучынскім раёне Гродзенскай вобласці, якая размешчана на беразе цудоўнага Берштаўскага возера і ракі Котра. Навокал сасновы бор – прыгажосць неймаверная! Гэтая зямля выгадавала многіх выдатных філолагаў. А ў XIV стагоддзі тут была паляўнічая рэзідэнцыя князёў ВКЛ.

Таксама кожнаму трэба прыехаць у Полацк, пабываць у Полацкім Спаса-Еўфрасіньеўскім манастыры. Гэта вельмі светлае, намоленае месца.

**2.** Я раю чытаць кнігі нашых выкладчыкаў кафедры літаратуры. Арыгінальную, цікавую прозу Ганны Віктараўны Навасельцавай і тонкую, глыбокую лірыку Алены Уладзіміраўны Крыклівец.

**3.** Беларусам заўсёды былі характэрны вялікія сем'і і павага да старэйшых. У сучасным грамадстве, на жаль, гэта не распаўсюджана. Лічу, што трэба было б захаваць традыцыю стварэння вялікіх сем'яў, а таксама больш клапаціцца пра сваіх бацькоў. А яшчэ зараз мы вельмі рэдка ходзім адзін да аднаго ў госці. А раней на кожнае свята сям'я збіралася разам.

# ПРАЧЫТАНА...»



**Кацярына Эрнэстаўна АРЦЯМЁНАК, бібліятэкар І катэгорыі:**

**1.** Я б параіла наведаць Глыбокае, бо адтуль родам мая маці. Там вельмі прыгожая прырода і добразычлівыя, гасцінныя людзі. Яшчэ абавязкова ў гэтым горадзе звярніце ўвагу на касцёл Святой Троіцы – помнік архітэктуры XVIII стагоддзя.

Думаю, таксама неабходна ўсім пабываць у Полацку, дзе я, дарэчы, нарадзілася, і пазнаёміцца з гістарычнымі помнікамі гэтага горада.

**2.** Усім рэкамендую кнігу «Каласы пад сярпом тваім» Уладзіміра Караткевіча, дзе апісваюцца вельмі цікавыя падзеі, наша гісторыя. І наогул трэба прачытаць усе творы Караткевіча!

**3.** Па-першае, неабходна захоўваць нашу родную мову, размаўляць на ёй. Па-другое, не забываць беларускія народныя традыцыі і святы (Купалле, Жаніцьба Цярэшкі і г.д.).



**Міхаіл Леанідавіч ЦЫБУЛЬСКІ, дацэнт, кандыдат мастацтвазнаўства, дацэнт кафедры выяўленчага мастацтва:**

**1.** Замежнікам і ўсім гасцям Беларусі параіў бы наведаць Мінск, Віцебск і Гродна. Мінск і Гродна – каб адчуць сучасны і старажытны кантэкст Беларусі, еўрапейскасць беларускай нацыі. Віцебск – як радзіму Марка Шагала, культурную і мастацкую сталіцу краіны.

Беларусы могуць павандраваць па заходняй частцы нашай краіны, дзе больш гучна «грукае» сэрца беларускага народа, дзе больш выразна і сакавіта гучыць мова. Варта наведаць Глыбокае, Мосар, Браслаў, Ружаны, Нясвіж, Навагрудак, Мір, Пінск, Гервяты, убачыць выдатныя помнікі беларускай архітэктуры, палюбавацца прыгажосцю Браслаўскіх азёр.

**2.** З таго, што чытаў на розных этапах жыцця, асабліва запалі ў душу і вызначылі маю прыхільнасць да беларускай мовы творы Уладзіміра Караткевіча, вершы Рыгора Барадуліна і Алеся Разанава.

**3.** Па магчымасці захоўваць і зберагаць трэба ўсе звычаі беларускага народа, бо яны – сапраўдная частка яго «крывяноснай сістэмы», гісторыі і культуры. Праз іх з пакалення ў пакаленне передаюцца жыццёвы вопыт, маральныя, рэлігійныя сацыяльныя нормы і правілы. Гэта адшліфаваная часам мадэль паводзінаў.

Крыўдна, што страчаныя (ці амаль што страчаныя) некаторыя сапраўды ўнікальныя беларускія звычаі, сярод якіх, напрыклад, звычай велікоднага абыходу двароў з віншаваннямі, зычаннямі здароўя і дабрабыту. Ці можна забыць беларускую народную традыцыю частавання блізкіх і аднавяскоўцаў свежанінай, а таксама хлебам, садавінай, агароднінай новага ўраджаю? Яшчэ дзе-нідзе жыве старажытны звычай рабіць справы талакой і жыццесцвярджальная традыцыя гукаць вясну пасля абрыдлай зімы.

**Апытанне праводзіла Алеся МЯДЗІЛЬ.**

# «І НАША МОВА – З-ПАД КРЫЛА ДУШЫ»

Так называлася мерапрыемства, што прайшло на базе філіяла кафедры беларускага мовазнаўства ў сярэдняй школе №4 горада Віцебска і было прымеркавана да Міжнароднага дня роднай мовы, які святкуецца 21 лютага. У класе было шмат вучняў і студэнтаў-філолагаў, якія прымалі актыўны ўдзел у літаратурна-гульнявой пляцоўцы.



Мерапрыемства пачалося з паведамлення студэнткі 1 курса Кацярыны Селязень, якая расказала пра гісторыю свята роднай мовы. Затым студэнты і вучні чыталі вершы на беларускай мове. Вучаніцы 8 класа Ясенія Аляксеева і Насця Сцефаненкава правялі цікавую лінгвістычную гульню «Дапоўні прыказкі і прымаўкі». Студэнтка 3 курса Ганна Патапенка паведаміла, як праз прызму беларускіх афарыстычных выслоўяў выяўляецца змест паняцця «родная мова», а вядучыя, студэнткі 4 курса Дар'я Андрыца і Кацярына Лабэцкая расказалі пра безэквівалентную лексіку як крыніцу нацыянальна-культурнай інфармацыі пра наш народ і яго Радзіму.

Вучні ўгадвалі назвы, якія не маюць аднаслоўных адпаведнікаў у рускай мове. Напрыканцы імпрэзы прагучалі 10 запаведзяў пра мову, пра тое, што яе трэба берагчы, шанаваць, размаўляць на ёй, каб перадаць нашчадкам.

«Студэнты-практыканты вельмі адказна і сур'ёзна падышлі да падрыхтоўкі гэтага мерапрыемства, якое, на нашу думку, прайшло цікава і з карысцю для прысутных, – адзначыла Кацярына Лабэцкая. – Мы з Дашай Андрыца ўсё абмяркоўвалі, сцэнарый зацвярджалі непасрэдна з Аленай Сяргееўнай і метадыстам кафедры беларускага мовазнаўства Кацярынай Аляксандраўнай Зайцавай. Таксама ў падрыхтоўцы нам дапамагалі Марыя Чырвінская і Дар'я Навапашына».

Для чаго патрэбна праводзіць такія імпрэзы? Пра гэта расказала загадчык філіяла, дацэнт кафедры беларускага мовазнаўства, кандыдат філалагічных навук, дацэнт Алена Сяргееўна Дзядова:

«Міжнародны дзень роднай мовы надзвычай актуальны для нас. Сёння перад усімі свядомымі беларусамі стаіць задача папулярызаваць, пашыраць беларускую мову ва ўжыванні. Мова з'яўляецца падмуркам нацыянальнай свядомасці. Гэта – прадмет гонару кожнага народа.

Размаўляйце па-беларуску. Размаўляйце шчыра, з прыветнай усмешкай на вуснах. І тады за вамі, як пісала Цётка, асмеляцца іншыя.

**Марыя САЛАВЕЙ, студэнтка 3 курса ФлФ.**

